*В.А.Гуліцкая*

# РЭЙТЫНГАВАЯ АЦЭНКА ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ У СІСТЭМЕ ФІЛАЛАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Рэарганізацыя сістэмы адукацыі вышэйшай школы прадугледжвае не толькі змены ў працягласці тэрмінаў навучання, градацыі яе на бакалаўрыят і магістратуру, але і ўдасканаленне вучэбных праграм па ўсіх спецыяльнасцях і спецыялізацыях, а таксама ўсяго вучэбнага працэсу, у тым ліку і ацэнкі ведаў студэнтаў.

Каб аб'ектыўна ацаніць веды студэнта, на кафедры беларускай філалогіі выпрабоўваецца рэйтынгавая (дзесяцібальная) сістэма ацэнак, якая ўключае ўсе віды вучэбнай дзейнасці і занятасці студэнта. Асноўныя складнікі рэйтынгавай сістэмы кантролю ведаў па беларускай мове наступныя: 1) якасць вусных тэарэтычных адказаў студэнта на занятках; 2) своечасовае выкананне лабараторных работ; 3) актыўны ўдзел у навуковай рабоце (напісанне рэфератаў і навуковых артыкулаў, падрыхтоўка дакладаў на навуковую канферэнцыю, выкананне курсавых і дыпломных работ); 4) веданне бібліяграфічных крыніц па праграмным матэрыяле і найноўшых публікацый; 5) прамежкавы залік у выглядзе тэста па кожнай вывучанай тэме; 6) творчая праца, мэта якой ацаніць пісьменнасць, дакладнасць, лагічнасць, прыгажосць, стылістычную правільнасць выкладу ўласных думак студэнта па прапанаванай тэме; 7) дыктант ці слоўнікавы дыктант; 8) кантрольная работа па пэўным раздзеле; 9) самастойная работа па тэмах, якія не вывучаюцца на занятках; 10) выкананне дамашніх заданняў; 11) выніковае тэсціраванне па засвоеным матэрыяле за семестр; 12) наведванне заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны з гэтых відаў дзейнасці студэнта мае ўдзельную вагу (рэйтынг), якая ў залежнасці ад значнасці, ступені складанасці, самастойнасці, творчасці і іншага ацэньваецца ў балах. У час эксперыменту для сумарнай ацэнкі працы па беларускай мове з улікам розных відаў вучэбнай дзейнасці і занятасці студэнта выкарыстоўвалася табліца 1.

*Табліца 1*

| Віды вучэбнай дзейнасці студэнта | Колькасць работ | Максімальны бал за | |
|---|---|---|---|
| | | адны заняткі або адну работу | усе заняткі, работы |
| 1. Вусныя адказы | 15 | 1 | 15 |
| 2. Лабараторныя работы | 3 | 2 | 6 |
| 3. Навуковыя работы | 2 | 5 | 10 |
| 4. Веданне бібліяграфічных крыніц па раздзелах | 6 | 1 | 6 |
| 5. Прамежкавы залік (тэст) | 2 | 2 | 4 |
| 6. Творчая праца | 2 | 6 | 12 |
| 7. Дыктант | 2 | 5 | 10 |
| 8. Кантрольная праца | 2 | 2 | 4 |
| 9. Самастойная праца | 2 | 4 | 8 |
| 10. Дамашняе заданне | 15 | 0,5 | 7,5 |
| 11. Выніковае тэсціраванне | 2 | 5 | 10 |
| 12. Наведванне заняткаў | 15 | 0,5 | 7,5 |
| **Усяго** | | | **100** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даныя табліцы 2 дапамагаюць ацаніць веды па беларускай літаратуры з улікам адпаведных відаў працы.

*Табліца 2*

| Віды вучэбнай дзейнасці студэнта | Максімальны бал за | |
|---|---|---|
| | адны занятні або адну работу | усе заняткі, работы |
| 1. Вусныя адказы на семінарскіх занятках (удзел у дыскусіях; веданне аўтараў, тэкстаў; веданне тэорыі літаратуры; уменне суадносіць змест і форму) | 3 | 30 |
| 2. Творчая работа (напісанне рэцэнзій, анатацый на творы; падрыхтоўка спіса твораў пісьменнікаў) | 5 | 10 |
| 3. Навуковая работа (напісанне творчых партрэтаў, крытычных прац, дакладаў на навуковую студэнцкую канферэнцыю) | 10 | 20 |
| 4. Падрыхтоўка бібліяграфічных аглядаў; вядзенне чытацкіх дзённікаў | 5 | 10 |
| 5. Выкананне дамашніх заданняў | 1 | 10 |
| 6. Прамежкавы залік | 3 | 6 |
| 7. Самастойная работа | 2 | 4 |
| 8. Наведванне заняткаў | 1 | 10 |
| Усяго | | 100 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульная колькасць атрыманых балаў студэнтамі суадносіцца з ацэнкамі (табл.3).

*Табліца 3*

| Колькасць набраных балаў | Ацэнка, якая адпавядае балам |
|---|---|
| 91–100 | 10 |
| 81–90 | 9 |
| 71–80 | 8 |
| 61–70 | 7 |
| 51–60 | 6 |
| 41–50 | 5 |
| 31–40 | 4 |
| 21–30 | 3 |
| Не ніжэй за 20 | 2 |

Як паказала выкарыстанне такіх комплексных нормаў ацэнкі ведаў, паспяхова (тыя, хто атрымаў ацэнкі 9–10) засвойваюць праграмны матэрыял 20% студэнтаў. Добрыя ацэнкі (8, 7, 6) атрымалі 50% навучэнцаў. Яны, як паказалі залікі і экзамены, глыбока засвоілі тэарэтычны матэрыял, набылі ўстойлівыя навыкі яго практычнага выкарыстання, праявілі здольнасць крытычна ацэньваць працу сваіх папярэднікаў і сваю ўласную, а асобныя студэнты выявілі і творчыя адносіны, што праяўляецца ў спробах пяра (гл. паэтычныя студэнцкія зборнікі “БУКет”, “Акварэлі”, “Завіруха кропель”). Што да тых, хто атрымаў ацэнкі 5 і 4, то кафедра расцэньвае такія веды як мінімальныя, бо засваенне тэарэтычнага матэрыялу ў навучэнцаў не сістэмнае, у іх не канкрэтныя веды і яны слаба аргументаваныя. У практычных матэрыялах не хапае доказнасці, адсутнічае логіка ў выкананні заданняў, сустракаюцца памылковыя сцвярджэнні,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не праяўляецца крытычнае стаўленне да розных поглядаў на праблему, не заўважаецца творчы падыход пры рэалізацыі атрыманых ведаў.

Думаецца, кожнаму выкладчыку пажадана мець табліцу рэйтынгавай ацэнкі ўсіх відаў вучэбнай работы студэнта, якая дапамагала б без цяжкасці і лішняй затраты часу даць выніковую ацэнку ведам студэнтаў (табл. 4).

*Табліца 4*

| Прозвішчы студэнтаў | Ацэнка ведаў па датах за | | | | | | | | | | | Агульная колькасць балаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вусныя адказы і наведванне | выкананне дамашніх заданняў | лабараторную працу | творчую працу | веданне бібл. крыніц | прамжкавы залік | навуковую працу | дыктант | кантрольную работу | самастойную работу | выніковае тэсціраванне | |
| | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | |

Такім чынам, рэйтынгавая ацэнка ведаў акажа дзейсную дапамогу выкладчыкам пры вызначэнні творчага і навуковага патэнцыялу студэнтаў, прымусіць іх адказна ставіцца да сваіх вучэбных абавязкаў. Безумоўна, без такога падыходу да кантролю ведаў нельга абысціся пры рэкамендацыі лепшых студэнтаў у магістратуру і аспірантуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ